ЛІТАРАТУРНЫЯ УНІВЕРСІТЭТЫ

# НЕ ЗАСТАЦЦА НЕЗАЎВАЖАНЫМІ



***Дарагія сябры і калегі! Перад вамі працы студэнтаў філалагічнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Гэтыя хлопец і дзяўчаты сталі ўдзельнікамі сумеснага творчага праекта Купалаўскага ўніверсітэта і Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі; ініцыятар – наша калега па пісьменніцкай арганізацыі, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы, літаратуразнаўца, літаратурны крытык Аліна Эдмундаўна Сабуць. Пасля сустрэчы з моладдзю ў нашым офісе ў лістападзе мінулага года (дзе прайшоў занятак па тэме «Асновы тэорыі публіцыстыкі») як навуковы кіраўнік Аліна Эдмундаўна нечакана для мяне прапанавала сваім студэнтам звярнуць увагу на адзін з маіх артыкулаў, прысвечаны зборніку лірыкі таленавітай беларускай паэткі Тамары Мазур. Кніга называецца «Васількі на світанні». Артыкул называецца «Васілёк – кветка годная», надрукаваны ў штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва» за 22 жніўня 2025 года. Я чалавек вельмі сціплы і не ведаю, чаму ўвагу юных філолагаў прыцягнуў менавіта гэты матэрыял. Хаця артыкул лічу ўдалым. Як жа мне было цікава, хвалююча і прыемна чытаць гэтыя рэфлексіі! Лічу сваім абавязкам падзякаваць Тамару Міхайлаўну Мазур, Аліну Эдмундаўну Сабуць і ўсіх аўтараў рэфлексій. Шаноўнае спадарства, Павел, Ангеліна, Вікторыя, Дар'я, Анжэла! Якія ж вы малайцы! Вы прадставілі новае бачанне маёй працы ды і проста сагрэлі цяплом сваёй увагі. Дай Бог вам поспехаў у вучобе і жыцці. Калі ласка, працягвайце свае даследаванні і рэфлексіі. Гэта вельмі каштоўна і важна для сучасных літаратараў Прынёмання. Гэта пераконвае нас у тым, што ў нашай справы ёсць будучыня. А матэрыяламі для рэфлексій мы будзем вас забяспечваць.***

***З павагай і ўдзячнасцю,***
***член СПБ Дзмітрый Радзівончык***
*(Гродна)*



# *Водгукі-рэфлексіі на рэцэнзію Дзмітрыя Радзівончыка “Васілёк – кветка годная”*

***

Сучасная беларуская літаратурная крытыка – з’ява неадназначная і часта палярная. Яна можа быць альбо залішне акадэмічнай і далёкай ад жывога чытача, альбо, наадварот, скатвацца ў павярхоўны пераказ сюжэту з эмацыйнымі ацэнкамі “спадабалася/не спадабалася”. На гэтым фоне працы, якія імкнуцца да глыбокага, але пры гэтым даступнага аналізу, успрымаюцца як сапраўдны глыток свежага паветра. Менавіта такім творам для мяне стала рэцэнзія Дзмітрыя Радзівончыка “Васілёк – кветка годная”.

Першае, што прыцягвае ўвагу, – гэта сама назва. Яна адначасова паэтычная і палемічная. “Васілёк” – гэта не проста кветка, а адзін з ключавых архетыпаў беларускай культуры, сімвал роднай зямлі, блакітнага неба і чысціні. Здавалася б, гэты вобраз настолькі часта выкарыстаны ў літаратуры, што стаў амаль банальным і стэрыятыпным. Аднак Дзмітрый Радзівончык праз прыметнік *“годная”* нібыта ўступае ў завочную спрэчку з тымі, хто лічыць гэты сімвал (і, магчыма, твор, які аналізуецца) архаічным ці залішне традыцыйным. Назва адразу задае тон: гэта будзе не проста аналіз, а абарона, сцвярджэнне каштоўнасці.

Што асабліва каштоўна ў рэцэнзіі Дз. Радзівончыка – гэта яго ўменне бачыць за канкрэтным творам агульныя тэндэнцыі і праблемы сучаснай літаратуры. Ён не абмяжоўваецца простым разборам сюжэтных ліній ці характарыстыкай персанажаў. Крытык разглядае твор у шырокім кантэксце: культурным, гістарычным і літаратурным.

На маю думку, цэнтральная ідэя рэцэнзіі палягае ў наступным: традыцыйныя нацыянальныя сімвалы і матывы не з’яўляюцца састарэлым матэрыялам. Іх каштоўнасць і актуальнасць залежаць ад мастацкага майстэрства аўтара, ад яго здольнасці надаць ім новае гучанне, упісаць у сучасны светапогляд. Аўтар паказвае, як “васілёк” з простага этнаграфічнага элемента ператвараецца ў складаны філасофскі сімвал, які адлюстроўвае не толькі любоў да радзімы, але і пытанні ідэнтычнасці, памяці, сувязі пакаленняў у глабалізаваным свеце.

Праца Дзмітрыя Радзівончыка – гэта ўзор таго, як літаратурная крытыка можа не толькі тлумачыць твор, але і ўзбагачаць яго ўспрыманне, адкрываць новыя пласты сэнсаў, якія маглі застацца незаўважанымі пры першым чытанні. Гэта не проста рэцэнзія на канкрэтны твор, а важнае разважанне пра шляхі развіцця сучаснай беларускай літаратуры, пра яе карані і перспектывы.

“Васілёк – кветка годная” – гэта не толькі ўдалая назва, але і дакладная формула, якую можна прымяніць да самой рэцэнзіі. Гэта годная, глыбокая і прафесійная праца, якая не проста інфармуе, а запрашае да дыялогу, да сумеснага разважання, што, на мой погляд, з’яўляецца найвышэйшай каштоўнасцю любой якаснай рэцэнзіі.

***Вайцяховіч Павел,***
***студэнт 3 курса спец. “Беларуская філалогія”***



***

Аналіз зборніка Тамары Мазур «Васількі на світанні» нагадвае стварэнне складанага ўпрыгожвання, дзе крытык Дз. Радзівончык паказвае сябе не проста назіральнікам, а майстрам, які ўмее бачыць брыльянт там, дзе іншыя заўважаюць толькі звычайныя камяні.

Найбольш моцны бок Радзівончыка-крытыка – гэта яго філасофскі падыход да паэзіі. Калі ён бачыць у зборніку «каласальны запас нацяжэння» і гаворыць пра «святы абавязак сапраўднага паэта», то ператварае рэцэнзію з простага агляду ў маніфест.
Аднак, здаецца, што Дзмітрый Радзівончык часам занадта сур'ёзна ставіцца да паэзіі. Яго ўласны тэкст нагадвае цяжкі духоўны трактат, дзе няма месца лёгкасці і гульні. Як бы таленавіта ні гучаў тэкст, часам хочацца, каб крытык дазволіў сабе і чытачу раскрыць крыллі…

Схільнасць да «цяжару» і «абавязку» робіць яго погляд на паэзію некалькі аднабаковавым. Быццам ён лічыць, што сапраўдная паэзія можа быць толькі суровай і адказнай, забываючы, што натхненне – гэта часам і лёгкі паветраны парус, а не толькі цяжкі якар.

Дзмітрыю Радзівончыку варта паспрабаваць свой бліскучы аналітычны розум накіраваць на больш лёгкія і гуллівыя тэксты. Яго ювелірнае вока і філасофская глыбіня маглі б адкрыць новыя далячыні ў паэзіі, якая не прэтэндуе на «святы абавязак», але мае сваю каштоўнасць. Бо сапраўдны майстар павінен умець ацэньваць і брыльянты, і лёгкія срэбныя пацеркі, якія прыносяць радасць.

Дз. Радзівончык – гэта крытык, чый аналітычны розум і філасофская глыбіня выклікаюць захапленне. Але, як кожны майстар, ён мае сваю нішу – яго цікавіць перш за ўсё «цяжкі сплаў» духоўных пошукаў. Калі б ён дазволіў сабе час ад часу пагуляць з тэкстам, яго крытыка набыла б новае вымярэнне – вымярэнне паэтычнай радасці, якое часта бывае не менш важным, чым паэтычны подзвіг.

*Лаўрушчык Ангеліна,*
*студэнтка 3 курса спец. "Беларуская філалогія"*



***

Адной тэорыі мала, заўсёды павінна быць практыка…

“Публіцыстычная крытыка і місія крытыка ў літаратуры” – гэта цікавая тэма, якая прапанавалася нам у межах вывучэння нашага асноўнага курса “Асновы тэорыі публіцыстыкі”. Наведванне офіса Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі стала цудоўнай магчымасцю для нас, студэнтаў, “дакрануцца” да крытыкі ў яе практычным выглядзе. У офісе нас сустрэў Дзмітрый Мікалаевіч Радзівончык, які з’яўляецца не толькі паэтам, але і дзеючым крытыкам.

Дзмітрый Мікалаевіч падзяліўся сваімі думкамі наконт перспектывы крытыкі, місіі крытыка, адказаў на хвалюючыя нас пытанні, а таксама зачытаў сваю рэцэнзію на зборнік каляжанкі па пяру Тамары Мазур.

Хочацца адзначыць, што рэцэнзія ўражвае сваёй шчырасцю і паважлівым стаўленнем як да самой аўтаркі зборніка, так і да беларускай літаратурнай традыцыі ў цэлым. Дзмітрый Мікалаевіч не проста аналізуе зборнік, а спрабуе адчуць яго ўнутраны рытм, настрой і сімволіку. Асабліва каштоўна, што аўтар звяртае ўвагу не толькі на мастацкія асаблівасці кнігі, але і на яе культурнае значэнне: васілёк трактуецца як неад’емны сімвал беларускасці, цвярозага характару і прыгажосці роднай зямлі. Асобнай увагі вартая здольнасць Дзмітрыя Мікалаевіча падкрэсліць сувязь паміж вобразнасцю зборніка і эмоцыямі, якія ён выклікае ў чытача.

Вяртаючыся да самага пачатку маіх разваг, атрымліваецца, што я не толькі тэарэтычна, але і практычна паспрабавала сябе ў ролі крытыка, аналізуючы рэцэнзію Дзмітрыя Мікалаевіча. Адзначу, што крытыкаваць – гэта дастаткова складаная праца: трэба быць аб’ектыўным і зацікаўленым у тым, каб да тваіх думак прыслухоўваліся. Але да гэтага варта імкнуцца, бо, як гучала на нашай сустрэчы, “толькі канструктыўная крытыка мае месца быць!”

***Касцецкая Анжэла,***
***студэнтка 3 курса спец. “Беларуская філалогія”***



***

Цёплы летні дзень. Жытнёвае поле. Праз жытняе золата крочу вузенькай сцяжынкай. Мой унутраны стан разумеюць блакітныя кветкі – васількі. Яны сваімі вочкамі падміргваюць мне, усміхаюцца.

Васілёк – сімвал Беларусі, сімвал Максіма Багдановіча. Успамінаюцца паэтавы радкі: «…І тчэ, забыўшыся, рука, заміж персідскага ўзора, цвяток радзімы васілька». Такія ўспаміны ўсплылі ў маёй свядомасці пасля прачытання толькі назвы рэцэнзіі Дз. Радзівончыка «Васілёк – кветка годная».

У рэцэнзіі аўтар, на маю думку, узнімае тэму паэта і паэзіі. Праз свае разважанні Дз. Радзівончык, аналізуючы творчасць Тамары Мазур, паказвае якой павінна быць творчасць і якім павінен быць паэт: шчырым, пранікнёным, тым, хто не дае пацямнець ідэалам. Адчуваецца, што крытык суадносіць асобу Т. Мазур з класікамі беларускай літаратуры: М. Багдановічам, У. Караткевічам. Паэзія Тамары Мазур, як і паэзія М.Багдановіча, меладычная, пявучая. Аўтар здольны адчуваць не толькі водар беларускасці, але і дыхаць ім як паветрам.

Нельга не пагадзіцца з Дз. Радзівончыкам у тым, што паэтэса здолела пашпартызаваць кожны раздзел кнігі цытатамі. Аўтар рэцэнзіі параўноўвае васількі з усімі намі, беларусамі, якія з'яўляюцца сімвалам чалавечых якасцей і нашай духоўнай культуры: «Гэта ўсё мы, беларусы – сімпатычныя палявыя кветкі, якія пераадолелі холад непагадзі і начную цемру».

Рэцэнзія напісана ў форме дыялогу з чытачом, пра што сведчыць пытальна-адказавая форма аповеду: «З каго б вы думалі?» Прычым – неаднаразова. Для ўзмацнення эмацыйнасці выкарыстоўваюцца клічныя сказы.

Аўтарам уздымаецца канкрэтная праблема: «У сучаснай паэзіі не хапае гімнаў простаму рабочаму чалавеку».

І хоць жытнёвае поле сімвалізуе жыццё, але і васількі – прыгажосць у гэтым жыцці, якую не мог не заўважыць Дз. Радзівончык. «Добра быць коласам, але шчаслівы той, каму давялося быць васільком. Бо нашто каласы, калі няма васількоў?..», – такі перазоў з беларускага класіка Максіма Багдановіча.

***Янкелайць Дар'я,***
***студэнтка 3 курса спец. "Беларуская філалогія"***



***

Часам здаецца, што паэзія – гэта не проста словы, злучаныя ў радкі, а жывая сутнасць, якая здольная кранаць душу і прымусіць нас глядзець на свет па-новаму. Менавіта такое адчуванне выклікае знаёмства са зборнікам Тамары Мазур “Васількі на світанні” і рэцэнзіяй Дзмітрыя Радзівончыка на яго. Гэта тэксты, якія не проста апісваюць рэчаіснасць, а праз сімвалы і вобразы шукаюць адказы на пытанні чалавечага існавання.

Рэцэнзія Дз. Радзівончыка прысвечана асэнсаванню асноўнай тэмы зборніка Тамары Мазур – сувязі чалавека з роднай зямлёй, прыродай і нацыянальнай культурай. Галоўная думка рэцэнзіі заключаецца ў тым, што паэзія аўтаркі не толькі захоўвае традыцыі беларускай літаратуры, але і ўзбагачае іх новымі сэнсамі. Аўтар рэцэнзіі падкрэслівае, што васілёк, як цэнтральны сімвал зборніка, увасабляе годнасць, чысціню і непахіснасць – якасці, якія сёння так патрэбныя кожнаму з нас.

Дз. Радзівончык умела будуе кампазіцыю сваёй рэцэнзіі, спалучаючы апісанне і разважанне. Ён уважліва аналізуе зборнік, звяртаючы ўвагу на яго стылёвыя і кампазіцыйныя асаблівасці. Напрыклад, аўтар адзначае прастату і лаканічнасць вершаў Тамары Мазур, іх здольнасць выклікаць моцныя эмоцыі праз мінімалізм выказвання. У рэцэнзіі сустракаюцца цікавыя параўнанні і метафары, якія ўзбагачаюць аўтарскую ацэнку вершаў. Асабліва кранальна гучыць думка пра тое, што паэзія Тамары Мазур – гэта своеасаблівы масток паміж прыродай і чалавекам.

Дз. Радзівончык падаецца чалавекам, які тонка адчувае паэзію. Яго падыход да аналізу зборніка насамрэч глыбокі і ўдумлівы. З ім лёгка пагадзіцца, бо яго думкі пра духоўны змест вершаў і іх значнасць для беларускай культуры выглядаюць надзвычай пераканаўча. Чытаючы рэцэнзію, адчуваеш, што аўтар не проста аналізуе, а сапраўды перажывае і ўспрымае паэзію Тамары Мазур як важную літаратурную каштоўнасць.
Назва “Васілёк – кветка годная” з’яўляецца вельмі ўдалай. Яна адразу прыцягвае ўвагу чытача і падкрэслівае цэнтральны сімвал кнігі. Васілёк – гэта не толькі сімвал беларускай прыроды, але і метафара чалавечай годнасці, чысціні і любові да Радзімы. Назва адлюстроўвае галоўную ідэю як рэцэнзіі, так і самога зборніка.

Рэцэнзія Дз. Радзівончыка – гэта не проста аналіз паэтычнага зборніка, гэта своеасаблівы дыялог паміж аўтарам, чытачом і паэткай. Чытаючы яе, адчуваеш жаданне вярнуцца да каранёў, задумацца пра ўласнае стаўленне да роднай зямлі і традыцый. Гэта натхняе і ўзбагачае, што падкрэслівае місію сапраўднай літаратуры.

***Грыгаровіч Вікторыя,***
***студэнтка 3 курса спец. “Беларуская філалогія”***

ЛІТАРАТУРНЫЯ УНІВЕРСІТЭТЫ